змены ў адносінах паміж літоўскім урадам і ўрадам БНР, было спынена яго фінансаванне і згорнута дзейнасць Міністэрства беларускіх спраў. Пазіцыі БНР у Літве былі значна падарваны. Літва пасля Віленскага сейма не праявіла ніякай актыўнасці ў адносінах да беларусаў. Беларуска-літоўскія сувязі пачалі руйнавацца. Сітуацыю ўскладняў і раскол у беларускім нацыянал-дэмакратычным руху. Першапачатковая розніца ў поглядах на праблему знешнепалітычнай арыентацыі вылілася ў адкрытае супрацьстаянне з яўнымі спробамі дыскрэдытацыі палітычных апанентаў.


1. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі : У 2 кн. / Уклад., падрыхт. тэксту, уступ. арт, камент, пер., паказ. С. Шупы. – Вільня – Нью-Ёрк – Мінск – Прага : Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва : Т-ва бел. пісьменства “Наша ніва”, 1998. – Т. 1. – Кн. 1. – 860 с.
2. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі : У 2 кн. / Уклад., падрыхт. тэксту, уступ. арт, камент, пер., паказ. С. Шупы. – Вільня – Нью-Ёрк – Мінск – Прага : Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва : Т-ва бел. пісьменства “Наша ніва”, 1998. – Т. 1. – Кн. 2. – 1721 с.
3. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зборнік дакументаў і матэрыялаў : у 4. т. / Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.– Мн. : Юніпак, 2008. – Т. 1.: 1 жніўня 1914 – 18 сакавіка 1921 гг. : у 2-х ч. Ч. 1.: 1 жніўня 1914 – 31 снежня 1919 гг. / [складальнікі: А. Ф. Вялікі і інш.]. – 537 с.
4. Багалейша, С. В. Беларуска-літоўскія ўзаемаадносіны ў 1915–1924 гг. / С. В. Багалейша. – Мінск : БДАТУ, 2014. – 232 с.
5. Засецкі, М. Міністэрства беларускіх спраў за 10 месяцаў існавання. Кароткі нарыс / М. Засецкі // Часопіс Міністэрства Беларускіх Спраў. – 1919. – № 1. – С. 3–9.
6. Знешняя палітыка Беларусі : зборнік дакументаў і матэрыялаў / Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь [і інш.]; [Склад.: У. М. Міхнюк, рэдкал.: І. І Антановіч (старшыня) і інш.]. – Т. 1. (1917–1922 гг.). – Мн. : БелНДІДАС : Выдавецкі цэнтр БДУ, 1997. – 395 с.
7. Родны край. – 1919. – 22 чэрвеня.


## ВЫДЗЯЛЕННЕ ЛАТГАЛЬСКІХ ПАВЕТАЎ СА СКЛАДУ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ

А. В. Бараноўскі (Мінск)

Латгалія – усходні гісторыка-культурны рэгіён Латвіі, размешчаны па правым беразе Даўгавы (Заходняй Дзвіны) ад ракі Айвіексце на захадзе да межаў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь на ўсходзе. У пачатку XX ст. яна ўваходзіла ў склад Віцебскай губерні і дзялілася на Дзвінскі, Люцынскі і Рэжыцкі паветы.

Паводле дадзеных першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. у Латгаліі пражывала 501623 чалавека. Самым населеным паветам быў Дзвінскі (сярэдняя шчыльнасць насельніцтва 61,4), найбольш рэдкім насельніцтва было ў Люцынскім павеце (27,86). Паводле

Рэпазіторый ВГУ

нацыянальнага складу першае месца займалі латышы (50,6%), затым ішлі рускія разам з беларусамі і ўкраінцамі (29%), яўрэі (12,7%), палякі (6,10%), немцы (0,9%) і іншыя. У Люцынскім і Рэжыцкім паветах пераважала латышскае насельніцтва (адпаведна 64,2% і 57,9%). Адносную большасць (39%) латышы мелі і ў Дзвінскім павеце. Беларусаў у Люцынскім павеце налічвалася 20,5%, у Дзвінскім – 13,8% і ў Рэжыцкім – 5,4% [1].

Латгалія мела цэлы шэраг асаблівасцяў, якія скláліся гістарычна. Галоўнай з іх была адміністрацыйная адасобленасць Латгаліі ад астатняй часткі губерні, што ў далейшым прывяло да жадання мясцовага насельніцтва вылучыцца са складу Віцебскай губерні.

Першыя спробы пачаліся ўжо пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі, калі Латгальскім таварыствам дапамогі ахвярам вайны ў Петраградзе было узнята пытанне аб выдзяленні са складу Віцебскай губерні Дзвінскага, Люцынскага, Рэжыцкага паветаў і аб'яднанні іх з Курляндыяй і Ліфляндыяй. Дадзенае пытанне павінна было быць вырашана на аб'яднальным з'ездзе (кангрэсе), які планавалася правесці ў Рэжыцы.

З'езд латышоў Латгаліі (Першы Латгальскі кангрэс) адбыўся 26–27 красавіка (9–10 мая) 1917 г. у г. Рэжыца. На ім прысутнічала па два прадстаўнікі ад кожнай воласці і ад кожнага прыходу Дзвінскага, Люцынскага і Рэжыцкага паветаў, па адным прадстаўніку ад арганізаваных калоній і 12 прадстаўнікоў ад латышоў-латгальцаў латышскіх стралковых палкоў. Усяго 350 чалавек з іх 232 дэлегаты з правам голасу. Кангрэс прыняў рэзалюцыі аб аб'яднанні латышоў Дзвінскага, Люцынскага і Рэжыцкага паветаў з латышамі Курляндыі і Ліфляндыі "у адзін нацыянальны аўтаномны арганізм у Рускай Дзяржаве". Было таксама прынята рашэнне ўтварыць Латгальскі Часовы Земскі Савет з 60 чалавек (36 прадстаўнікоў ад латышоў, 12 – рускіх, 8 – яўрэяў, 3 – палякаў, 1 – ад іншых народнасцяў) для кантролю за ўсімі культурна-нацыянальнымі справамі краю [6].

З прыходам да ўлады бальшавікоў у латышоў Латгаліі з'явілася магчымасць нарэшце ажыццявіць рашэнні Першага латгальскага кангрэсу, паколькі пры Часовым урадзе гэта не атрымалася зрабіць. 3–4 (16–17) снежня 1917 г. у г. Рэжыца адбыўся З'езд Саветаў латгальскіх паветаў Віцебскай губерні (Другі Латгальскі кангрэс). На ім прысутнічалі прадстаўнікі палітычных партый, грамадскіх арганізацый і прафесійных саюзаў усіх нацыянальнасцей Латгаліі. Усяго 335 чалавек. Удзельнікі з'езду падзяліліся на дзве групы – прадстаўнікоў латышскага каталіцкага духавенства (Франц Трасун, Язэп Ранцан, Нікадзім Ранцан, Казімір Скрында і інш.) і прыхільнікаў Франца Кемпа. Першая група выступала за аб'яднанне Латгаліі з Курляндыяй і Ліфляндыяй, а таксама атрыманне аўтаноміі; другая група лічыла, што Латгаліі неабходна спачатку самой атрымаць аўтаномію ад Расіі, а потым прымаць рашэнне аб аб'яднанні. У выніку Другі Латгальскі кангрэс прыняў рэзалюцыі аб аддзяленні Дзвінскага, Люцынскага і Рэжыцкага паветаў ад Віцебскай губерні. Для



Репозиторий ВГУ

кіраўніцтва ўсімі справамі краю быў абраны Часовы выканаўчы Савет сялянскіх, рабочых, батрацкіх і салдацкіх дэпутатаў Латгаліі з 36 чалавек. Савет са свайго асяроддзя абраў выканаўчы камітэт з 9 чалавек [8].

5(18) снежня 1917 г. Выканкам Савета сялянскіх, працоўных, батрацкіх і салдацкіх дэпутатаў Латгаліі звярнуўся з хадайніцтвам ў Савет Народных Камісараў Савецкай Расіі, у якім прасіў выдаць асобы дэкрэт аб аддзяленні Дзвінскага, Люцынскага і Рэжыцкага паветаў ад Віцебскай губерні [8]. СНК 14 (27) снежня 1917 г. вылучыў Дзвінскі, Люцынскі і Рэжыцкі паветы са складу Віцебскай губерні і перадаў іх Ліфляндскай губерні.

24 снежня 1917 г. (6 студзеня 1918 г.) у г. Валк выканаўчы камітэт Савета працоўных, салдацкіх і беззямельных дэпутатаў Латвіі (Іскалат) прыняў дэкларацыю пра самавызначэнне Латвіі ў складзе Савецкай Расіі. Была ўтворана Савецкая Латвія (так званая Рэспубліка Іскалата), улада якой распаўсюджвалася на тэрыторыю Ліфляндскай губерні, не занятаю германскімі войскамі. Аднак савецкая ўлада ў Відзэмэ і Латгаліі пратрымалася толькі да наступу нямецкіх войскаў у лютым 1918 г. 18 лютага 1918 г. немцы занялі Дзвінск, а 22 лютага – Рэжыцу і Люцын.

Пасля вызвалення латышскіх зямель, Часовы працоўна-сялянскі ўрад Латвіі 17 снежня 1918 г. абвясціў маніфест аб устанаўленні савецкай формы ўлады ў краі. 22 снежня СНК РСФСР выдаў дэкрэт аб прызнанні незалежнасці Савецкай Рэспублікі Латвіі. У выніку 13 студзеня 1919 г. І з’езд Саветаў працоўных, беззямельных і стралковых дэпутатаў аб’яднанай Латвіі абвясціў стварэнне Латвійскай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі. Дзвінскі, Люцынскі і Рэжыцкі паветы ўвайшлі ў склад ЛССР.

Пасля прыняцця рашэння аб перадачы дадзеных паветаў у склад Ліфляндскай губерні, падчас нямецкай акупацыі і пасля вызвалення Латгаліі Віцебская губерня падтрымлівала сувязь з Дзвінскім, Люцынскім і Рэжыцкім паветамі, а яны, у сваю чаргу, з Віцебскам. Пасля абвяшчэння ЛССР зноў паўстала пытанне аб адміністрацыйнай прыналежнасці латгальскіх паветаў.

29 студзеня 1919 г. Віцебскі губвыканкам атрымаў тэлеграму ад намесніка старшыні ўрада ЛССР Карла Данішэўскага, у якой паведамлялася, што, згодна з пастановай І з’езда Саветаў Латвіі, Дзвінскі, Люцынскі і Рэжыцкі паветы ўключаны ў склад ЛССР, а таму адміністрацыйна, палітычна і эканамічна дадзеныя паветы падпарадкоўваюцца савецкаму ўраду Латвіі [4].

Аднак нягледзячы на дадзеную тэлеграму, кіраўніцтва Віцебскай губерні працягвала змагацца за паветы. Так, на пасяджэнні прэзідыума Віцебскага губкама РКП(б) 2 лютага 1919 г. абмяркоўвалася становішча спраў у Рэжыцкім павеце. Спачатку слова ўзяў старшыня губкама Сямён Крылоў. Ён праінфармаваў прысутных аб тым, што ў Рэжыцкім партыйным камітэце адбываецца барацьба паміж латгальцамі і “нашымі таварышамі”, у якой у дадзены час латгальцы ўзялі верх. Член прэзідыума



Репозиторий ВГУ

губкама Аляксандр Шыфрэс выступіў супраць расколу, ён прапанаваў звярнуцца ў ЦК РКП(б), для атрымання дазволу на правядзенне рэферэндуму, бо, дзякуючы яму, стане зразумела, куды імкнуцца Дзвінскі, Люцынскі, і Рэжыцкі паветы: да Віцебскай губерні РСФСР ці ЛССР. У выніку была прынята пастанова: накіраваць у ЦК РКП(б) телеграму, у якой хадайнічаць пра прывядзенне рэферэндуму для канчатковага высвятлення становішча ў Дзвінскім, Люцынскім і Рэжыцкім паветах [5].

Невядома, ці атрымалі ў ЦК РКП(б) тэлеграму ад Віцебскага губкама, аднак 7 лютага 1919 г. старшыня УЦВК Якаў Свярдлоў у сваёй тэлефанаграме праінфармаваў кіраўніцтва Віцебскай губерні, што Дзвінскі, Люцынскі і Рэжыцкі паветы з'яўляюцца састаўной часткай Савецкай Латвіі. 8 лютага 1919 г. на падставе дадзенай тэлефанаграмы Віцебскі губвыканкам выдаў загад: Дзвінскі, Люцынскі і Рэжыцкі паветы лічыць далучанымі да Латвіі [2].

25 лютага 1919 г. у газеце "Известия Витебского Губернского Совета крестьянских, рабочих, красноармейских и батрацких депутатов" быў апублікаваны артукул "Краевое совещание в Двинске", у якім распавядалася пра вынікі нарады, што там адбылася. Прадстаўнікі ад Саўнаркама, Саўнаргаса разам з прадстаўнікамі Дзвінскага, Дрысенскага, Рэжыцкага і Люцынскага паветаў абмяркоўвалі становішча Латгаліі. Выступоўцы ад латгальскіх паветаў прасілі ўрад Савецкай Латвіі аб прадастаўленні хлеба для галадаючага насельніцтва, на што урад ЛССР адказаў, што хлеб можа быць адпушчаны ў абмен на жывёлу. Падчас нарады было ўзнята пытанне аб утварэнні самастойнай Дзвінскай губерні, але дадзенае пытанне засталося адкрытым. Адначасова прадстаўнікі Дзвінскага, Рэжыцкага і Люцынскага паветаў выказаліся за далучэнне да Віцебскай губерні. На гэтым артыкул заканчваўся, знайсці больш падрабязную інфармацыю пра нараду у Дзвінску не ўдалося [7].

Канчаткова адміністрацыйна-тэрытарыяльная прыналежнасць Дзвінскага, Рэжыцкага і Люцынскага паветаў была вызначана падчас пасяджэння Прэзідыума УЦВК, якое адбылося 29 сакавіка 1919 г. Разглядзеўшы хадайніцтва Рэўваенсавета ЛССР аб далучэнні да Савецкай Латвіі латгальскіх паветаў, Прэзідыум УЦВК пастанавіў: дадзенае хадайніцтва задаволіць, далучыўшы Дзвінскі, Люцынскі і Рэжыцкі паветы да ЛССР [3].

Такім чынам, дагэтуль у гістарыяграфіі датай выдзялення Дзвінскага Рэжыцкага і Люцынскага паветаў са складу Віцебскай губерні і перадачы ў склад Латвіі лічылася 11 жніўня 1920 г., калі была падпісана мірная дамова паміж РСФСР і Латвійскай Рэспублікай, але дзякуючы архіўным дакументам, што захаваліся ў Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці, нам удалося даказать, што тры латгальскія паветы яшчэ ў сакавіку 1919 г. былі канчаткова перададзены ў склад Латвіі.

Рэпазіторый ВГУ

1. Алексеенков, П. В. Белорусы и латыши Латгалии в конце XIX – начале XX вв. / П. В. Алексеенков // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 1996. – № 2 (2). – С. 8–12.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 56. Воп. 1 Спр. 69. Арк. 8.
3. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1821. Воп. 1. Спр. 29. Арк. 211.
4. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 1821. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 23.
5. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 10050-п. Воп. 1. Спр. 26. Арк. 4.
6. Дмитриева, О. П. Национальные общности на территории Беларуси в годы Первой мировой войны (1914–1918 гг.) / О. П. Дмитриева. – Минск : Беларуская навука, 2017. – С. 186–187.
7. Известия Витебского Губернского Совета крестьянских, рабочих, красноармейских и батрацких депутатов – 1919. – 25 февр. – С. 4.
8. Октябрьская революция в Латвии: документы и материалы / [Отв. ред. канд. ист. наук А. А. Дризул]. – Рига : Изд-во Акад. наук Латв. ССР, 1957. – С. 302–303.

## УЧАСТИЕ БССР В ОСНОВАНИИ И ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ООН. ПЕРВЫЕ ПОСЛЕВОЕННЫЕ ГОДЫ

А. В. Давидович, С. А. Киселева (Минск)

В один из самых решающих этапов Второй мировой войны, в марте 1944 года в г. Гомеле состоялось важное событие для всей послевоенной истории БССР. Был принят закон о создании Народного комиссариата иностранных дел. В дальнейшем это позволило белорусской республике самостоятельно принимать ряд международных политических решений и вступить в Организацию Объединенных Наций. В связи с этим интересно будет узнать, какой была роль БССР в решении вопросов, стоявших в повестке дня ООН в первые послевоенные годы.

Долгим, сложным и противоречивым был путь к «объединению наций». Основные этапы этого пути таковы. Впервые совместная декларация США и Англии, получившая название «Атлантическая хартия», была подписана 14 августа 1941 г. В этом документе сказано, что после уничтожения фашизма следует объединить усилия на пути к миру.

В Лондоне 24 сентября 1941 г. проходила конференция, на которой делегация СССР подтвердила свое участие в этом союзе. В последующем к Атлантической хартии присоединились те, кто попал под фашистскую оккупацию, всего 9 стран.

Следующий шаг на пути к ООН – это документ «Декларация Объединенных Наций». Он принимался в январе 1942 г. в Вашингтоне и подписан представителями четырех государств – СССР, США, Англии, Китая. Затем этот документ подписали 22 государства.

В октябре 1943 г. новое совещание проводилось уже в Москве. В совместном заявлении были прописаны цели, задачи и сроки создания международной организации. Подведением итогов этих процессов стали реше-

Репозиторий ВГУ